УДК 37:314.1«1956/1969»(476)(091)

***Наталля Аляксандраўна Поляк***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. філасофіі і паліталогіі*
*Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта*
***Natallia Poliak***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Philosophy and Political Science*
*of Belarusian State Medical University*
e-mail: polyak77@mail.ru

# ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ РАБОЧЫХ У БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 50–70-х гг. ХХ ст.

*Вызначаны галоўныя напрамкі развіцця сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў Беларускай ССР у другой палове 50–70-х гг. ХХ ст. Ва ўмовах эканамічных пераўтварэнняў, якія выклікалі значнае павелічэнне колькасці рабочых, востра стаяла пытанне аб павышэнні іх кваліфікацыйнага ўзроўню. На аснове новых дакументаў вызначана месца школ з прафесійным навучаннем, прафесійна-тэхнічных вучылішч, школ рабочай моладзі, школ камуністычнай працы, завочных і вячэрніх школ, «народных універсітэтаў», тэхнікумаў і ВНУ у сістэме павышэння кваліфікацыі рабочых Беларусі. Сфармулявана выснова аб тым, што створаная савецкай уладай разгалінаваная сетка навучальных устаноў дазволіла дастаткова хутка палепшыць прафесійна-адукацыйны ўзровень рабочых.*

***Ключавыя словы:*** *эканамічнае развіццё БССР, Камуністычная партыя Беларусі, рабочы клас, навукова-тэхнічны прагрэс, прафесійнае навучанне рабочых, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, школы рабочай моладзі, завочнае навучанне, «народныя ўніверсітэты», вячэрняя форма навучання, школы камуністычнай працы.*

## *Vocational and Technical Education of Workers in the BSSR in the Second Half of the 1950s and 1970s*

*The article outlines the main directions of development of the vocational education system in the BSSR in the second half of the 50–70s of the twentieth century. In the context of economic transformations, which caused a significant increase in the number of workers, the question of increasing their level of qualifications became acute. Based on new documents, the author determines the place of vocational training schools, vocational schools, schools for working youth, communist labor schools, correspondence and evening schools, «people's universities», technical colleges and universities in the process of improving the skills of workers in Belarus. The article concludes that the extensive network of educational institutions created by the Soviet government made it possible to quickly increase the professional and educational level of workers.*

***Key words:*** *economy of the BSSR, Communist Party of Belarus, working class, scientific and technological progress, vocational training of workers, vocational schools, schools for working youth, correspondence education, «people's universities», evening courses, schools of communist labor.*

## Уводзіны

У беларускай савецкай гістарыяграфіі тэма станаўлення рабочага класа і яго ролі ў эканамічных пераўтварэннях была адной з самых папулярных. Гістарыяграфія дадзенага пытання вялікая. Існуючыя працы падрыхтаваны на значным гістарычным матэрыяле і раскрываюць пытанні камуністычнага будаўніцтва, выканання пяцігадовых планаў, удасканальвання вытворчых працэсаў, арганізацыі сацыялістычных спаборніцтваў, актывізацыі руха наватараў і перадавікоў. Значэнню рабочага класа ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і духоўным жыцці рэспублікі, ролі Кампартыі БССР у развіцці працоўнай актыўнасці і творчай ініцыятывы рабочых прысвяцілі свае працы Я. М. Бабосаў [1; 2], У. К. Коршук [3], Н. Н. Беляковіч [4] і інш. Адной з самых змястоўных з'яўляецца калектыўная манаграфія «История рабочего класса Белорусской ССР [5]. У манаграфіі ў праблемна-храналічнай паслядоўнасці прадстаўлены колькасны рост, павышэнне працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці рабочых. Вялікая ўвага надавалася ўдзелу рабочых ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы народнай гаспадаркі БССР. У меньшай ступені беларуская савецкая гістарыяграфія закранала структурныя змены ў складзе

рабочага класа, накірункі прафесійна-тэхнічнай адукацыі працоўных, рост узроўню кваліфікацыі ва ўмовах імклівага індустрыяльнага развіцця.

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі тэме рабочага класа ў гісторыі Беларусі надаецца мала ўвагі. Даследчыкі абыходзяць гэта пытанне, бо лічаць яго распрацаваным і ў сваіх працах прадметна не вывучаюць. Сярод беларускіх гісторыкаў, якія закранаюць тэму рабочых у 50–80-х гг. XX ст., можна ўзгадаць М. У. Смяховіча [6], А. А. Гужалоўскага [7], В. Г. Мазеца [8], М. Б. Несцяровіча [9], Т. В. Маржала [10]. У цяперашні час вельмі важна паказаць колькасныя і якасныя змены рабочага класа, якія сталі сацыяльным маркерам трансфармацыйных працэсаў у Савецкай Беларусі ва ўмовах завяршэння фарміравання індустрыяльнага грамадства і перахода да постіндустрыяльнага.

Здзіўляе невялікая ўвага сёняшніх даследчыкаў да гісторыі рабочага класа, хаця тэма забяспечана вялікай колькасцю крыніц. Шмат якія з іх апублікаваны ў статыстычных зборніках «Народное хозяйство БССР. Статистический сборник» [11] і іншых зборніках дакументаў: «Коммунистическая партия Белорусии в цифрах» [12], «Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов пленумов ЦК» [13] і інш. Вялікі масіў крыніц утрымліваюць фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь [14–16], дзе размешчаны пратаколы пасяджэнняў Сакратарыята ЦК КПБ, даведкі, справаздачы, лісты і іншыя дакументы справаводства.

У гістарыяграфіі склалася ўражанне аб рабочым класе перш за ўсё як аб галоўнай грамадска-палітычнай і вытворчай сіле – будаўніку камунізму, – але пад увагу не бралася, што ўнутраныя працэсы і структурныя змены ў гэтай буйной сацыяльнай групе значна ўплывалі на ход эканамічнага развіцця. Вядома, што 50-я гг. XX ст. сталі перыядам надзвычай буйнога колькаснага росту рабочага класа. Шляхамі папаўнення шэрагаў працоўных прамысловых прадпрыемстваў Беларускай ССР перш за ўсё былі перасяленцы з беларускай вёскі. Тыя людзі, якія станавіліся рабочымі ў першым пакаленні, зразумела, не мелі адпаведнай адукацыі і не валодалі прафесійна-тэхнічнымі навыкамі. Вырашыць адразу гэта пытанне было немагчыма, і савецкае кіраўніцтва, выкарыстоўваючы розныя формы і метады, імкнулася павысіць кваліфікацыйны ўзровень занятых на вытворчасці дзеля рэалізацыі маштабных эканамічных планаў.

Мэтай артыкула з’яўляецца вызначэнне асноўных форм і метадаў прафесійнай адукацыі рабочых у БССР у другой палове 50-х гг. – пачатку 70-х гг. XX ст. як аднаго з фактараў структурных змен у іх асяроддзі.

**Асноўная частка**

Характарыстык рабочага класа існуе шмат. Найбольш ужываным у савецкія часы з’яўляецца вызначэнне рабочых як галоўнай вытворчай і грамадска-палітычнай сілы, будаўніка камунізму [1, с. 226]. Новае вызначэнне рабочаму класу далі сучасныя расійскія даследчыкі. Паводле іх меркаванняў, рабочым класам называюцца людзі, занятыя ў матэрыяльнай вытворчасці пераважна фізічнай працай і аб’яднаныя ў клас за спецыфічныя сацыяльныя каштоўнасці [17, с. 169], або «класам, які не меў унутраных сувязей і не ўсведамляў сябе прыналежным да пэўнага асяроддзя [18, с. 8]. Праўда, вызначэння, якое б адлюстроўвала сацыяльна-эканамічныя характарыстыкі рабочага класа з улікам канкрэтна-гістарычных з’яў і назапашаных ведаў, пакуль даследчыкамі не сфармулявана.

Ва ўмовах эканамічнай мадэрнізацыі развіццё прамысловасці ў БССР ішло больш хуткімі тэмпамі, чым у іншых савецкіх рэспубліках. Сярэднегадавая колькасць рабочых у прамысловасці БССР павялічылася з 568,5 тыс. чалавек у 1960 г. да 1 193,6 тыс. чалавек у 1975 г., або ў 2,1 раза [5, с. 99]. Беларуская ССР становіцца індустрыяльнай краінай. Шляхам тытанічных намаганняў у прамысловасці былі дасягнуты значныя вынікі, але неабходна было далейшае развіццё з улікам навукаёмістых тэхналогій, а гэта выклікала структурныя змены ў складзе рабочага класа. Пачатыя эканамічныя змены выклікалі буйны колькасны рост рабочага класа. Паўстаў шэраг праблем, звязаных у першую чаргу з нізкім агульнаадукацыйным і прафесійным узроўнем занятых у вытворчасці. Была разгорнута палітыка па ўкараненню новых форм і метадаў атрымання адукацыі рабочымі.

Пасля выступлення М. С. Хрушчова у 1958 г. на з’езде УЛКСМ Вярхоўны Савет БССР прыняў «Закон аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі Беларускай ССР». Пачалася рэарганізацыя сярэдніх дзесяцігадовых школ у адзінаццацігадовыя з вытворчым навучаннем. Апошнія тры гады вучні павінны былі засвойваць вытворчую спецыяльнасць. Цэнтральны камітэт КПБ і Савет Міністраў БССР зацвердзілі пастанову «Аб плане развіцця сеткі агульнаадукацыйных школ і аб кантынгентах вучняў у школах рэспублікі на 1959–1965 гг.». Пачалася тэрміновая рэалізацыя прынятых рашэнняў і зацверджаных планаў па набліжэнні школы да вытворчасці. У 1959/1960 навучальным годзе 7 639 вучняў рэспублікі прыступілі да засвойвання 93 рабочых спецыяльнасцей. За сярэднімі школамі было замацавана 460 прадпрыемстваў (завод імя С. М. Кірава, Магілёўскі завод штучнага валакна, Віцебскі дывановы камбінат, Аршанскі льнокамбінат і інш.). На некаторых прадпрыемствах ствараліся навучальныя цэхі, а пры школах – тыпавыя вытворчыя майстэрні. Так, напрыклад, добра абсталяваную тыпавую майстэрню пабудавалі ў СШ № 1 г. Жодзіна работнікі Смалявіцкай ДРЭС [19, с. 77].

Першыя гады рэалізацыі рэформы паказалі, што набліжэнне школы да вытворчасці прынясе сваю карысць толькі ў выпадку правядзення заняткаў непасрэдна ў цэхах ці ў добра абсталяваных майстэрнях, калі будзе рэалізавана калектыўнае навучанне ў спалучэнні з індывідуальным. Ва ўмовах буйнога росту вытворчасці і імклівага развіцця новых галін прамысловасці не ўсе прадпрыемствы маглі стварыць умовы для навучання (у Гомелі для 11,6 тыс. навучэнцаў працаваў толькі адзін цэх) і арганізаваць працоўныя месцы для выпускнікоў (недахоп будаўнікоў пры празмернай колькасці швачак). Цяжкасці назіраліся ў забеспячэнні педагагічна-інжынернымі кадрамі, навучальнымі праграмамі, метадычнымі распрацоўкамі. Недасканальна была наладжана сувязь адукацыйных устаноў з заказчыкамі кадраў. У 1962 г. з 320 выпускнікоў школ з вытворчым навучаннем толькі 135 знайшлі працу па спецыяльнасці. Ніводная з дзяўчат – выпускніц СШ № 29 г. Мінска не пайшла працаваць па спецыяльнасці на камвольны камбінат [19, с. 78]. У сувязі са зніжэннем лічбы вучняў X класаў з 1959 па 1962 г. у цэлым па рэспубліцы ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР у 1966 г. пастанавілі скараціць колькасць класаў з вытворчым навучаннем.

Папулярным накірункам навучання было адкрыццё школ пры заводах і фабрыках. Рабочыя больш ахвотна атрымлівалі сярэднюю адукацыю або паляпшалі свой прафесійны-тэхнічны ўзровень непасрэдна на вытворчасці. Пры Мінскім трактарным заводзе працавала вячэрняя школа № 7, якую пабудавалі самі трактаразаводцы. Такія школы існавалі пры аўтамабільным, мотавелазаводзе, «Інтэграле» і інш. У пачатку 1960-х гг. на заводах адчыніліся ўстановы адукацыі з паскораным навучаннем, дзе праграма V–VIII класаў рэалізоўвалася за 2,5 гады. У 1965 г. прынялі навучэнцаў завочныя агульнаадукацыйныя школы і школы рабочай моладзі (ШРМ). Пашыралася дзейнасць Школ камуністычнай працы. Так, рабочыя – навучэнцы ШКП фабрыкі КІМ па прыкладзе завадчан-ленінградцаў дэманстравалі высокую прадукцыйнасць працы і паляпшалі якасць вырабаў [20, с. 70].

На працягу 1960-х гг. ішоў пошук найбольш рацыянальных форм навучання рабочых. У 1966 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб частковым змяненні працоўнай падрыхтоўкі», згодна з якой прафесійныя класы захоўваліся толькі там, дзе былі тэхнічныя ўмовы, удасканальвалася матэрыяльнае забеспячэнне тых прафесійна-тэхнічных вучылішч, дзе працягвала вучобу моладзь пасля сярэдняй школы. Менавіта на іх рабіўся акцэнт. Вучылішчам і іншым прафесійным установам адукацыі прадпісвалася павялічыць прыём моладзі пасля школы, гарантаваць працу выпускнікам, прадпрыемствам – заказчыкам кадраў трымаць бронь для маладых выпускнікоў і ўсяляк падтрымліваць маладых спецыялістаў [14]. У 1966/1967 навучальным годзе адчыніліся вучылішчы радыётэхнікі (у Брэсце), кулінарны (у Віцебску, Гомелі і Магілёве), металістаў (у Мінску, Жодзіне, Гомелі). Станавілася відавочным, што сярод апрабіраваных форм адукацыйна-прафесійнай падрыхтоўкі найбольш адпаведнымі патрабаванням часу былі прафесійна тэхнічныя вучылішчы для навучэнцаў з сярэдняй адукацыяй.

На ўдасканальванне працы навучальных устаноў і павелічэнне колькасці высокакваліфікаваных рабочых былі накірава-ны шматлікія рашэнні і пастовы ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. У жніўні 1967 г. Камітэту па прафесійна-тэхнічнай адукацыі пры Савеце Міністраў БССР прадпісвалася палепшыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных рабочых для народнай гаспадаркі. З перапіскі Савета Міністраў БССР за 1967 г. у сітуацыі, калі кадраў не хапала, вынікае, што ў «Будмантажіндустрыі» Мінпрамбуда БССР з трыццаці інжынераў толькі два мелі адпаведную адукацыю, а сямнаццаць не мелі нават агульнай сярэдняй адукацыі [15].

Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі загадвалася забяспечваць павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў, майстраў ПТВ. Адпаведным міністэрствам і ведамствам даручалася ўзмацніць прапаганду неабходнасці навучання рабочым прафесіям сярод моладзі [13, с. 128]. Прымаліся рашэнні па наладжванні прафесійнай адукацыі па галінах гаспадаркі: будаўніцтва, энергетыкі, геадэзіі, машынабудоўлі. Лічба вучылішч з 1966 г. за дзесяць гадоў вырасла з 115 да 176, а колькасць навучэнцаў значна павялічылася [21, с. 47].

Побач з пералічанымі формамі прафесійнага навучання ўжывалася арганізацыя гурткоў, курсаў, праца двухгадовых эканамічных школ (з 1972 г.). Актыўна дзейнічалі «народныя ўніверсітэты», арганізоўваліся лекцыі па эканоміцы і курсы павышэння кваліфікацыі па іншых галінах ведаў. Перадавіком была Беларуская чыгунка, дзе палова супрацоўнікаў у 1975 г. займалася ў «Школе эканамічных ведаў». У 1971/1972 навучальным годзе на Мінскім трактарным заводзе ўдасканальвалі свае эканамічныя веды каля 10 тыс. рабочых (1/3 частка калектыва) [5, с. 119]. Супрацоўнікі Мінскага медыцынскага інстытута ў межах дзейнасці «народнага ўніверсітэта» чыталі лекцыі працоўным калектывам заводаў і фабрык горада па пытаннях аховы здароўя і бяспекі на вытворчасці [16].

У рабочага класа былі шырокія магчымасці для навучання. У асяроддзі рабочых (часам з дапамогай адміністрацыйнага рэсурса партыйна-савецкіх органаў) у сферы адукацыі былі дасягнуты істотныя поспехі. Разгалінаваная сетка прафесійна-тэхнічных адукацыйных устаноў, школ рабочай моладзі, школ камуністычнай працы, вячэрніх і завочных школ, курсаў павышэння кваліфікацыі, «народных універсітэтаў» разам з папулярызацыяй ведаў і дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу садзейнічалі павелічэнню прафесійна-адукацыйнага ўзроўню працоўных.

**Заключэнне**

Пры ўсіх станоўчых зрухах у БССР захоўваліся пэўныя цяжкасці, звязаныя з матэрыяльна-тэхнічным, кадравым і метадычным забеспячэннем. Тым не менш дзякуючы мэтанакіраванай практыцы савецкіх органаў улады ўжо ў 70-х гг. ХХ ст. у структуры рабочага класа Беларускай ССР адбыліся змены, і колькасць рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй павялічылася. Гэта, у сваю чаргу, садзейнічала далейшаму навукова-тэхнічнаму прагрэсу і ўкараненню ў прамысловасці механізацыі і аўтаматызацыі прамысловых працэсаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Бабосов, Е. М. Социальные аспекты научно технической революции / Е. М. Бабосов. – Минск : БГУ, 1976. – 477 с.

2. Бабосов, Е. М. Ведущая роль рабочего класса в исторических рамках зрелого социализма. Социальное развитие его основных отрядов / Е. М. Бабосов // Тез. докл. Всесоюз. конф. «Рабочий класс: показатели политической, трудовой и нравстенной активности». – Минск : Наука и техника, 1984. – С. 3–8.

3. Коршук, В. К. Возрастание руководящей роли партии в коммунистическом строительстве (на материалах компартии Беларуси) 1959–1973 / В. К. Коршук. – Минск : Беларусь, 1974. – 432 с.

4. Белякович, Н. Н. Социальная активность рабочего класса / Н. Н. Белякович. – Минск : БГУ им. В. И. Ленина, 1978. – 104 с.

5. История рабочего класса Белорусской ССР : в 4 т. / редкол.: И. Е. Марченко [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1987. – Т. 4 : Рабочий класс БССР на этапе совершенствования социализма (1961–1986). – 510 с.

6. Смехович, Н. В. История советского госудасртва в зеркале «новой» исторической науки России (конец XX – начало XXI века) / Н. В. Смехович // Гіст. археал. зб. / гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – Вып. 36. – С. 63–82.

7. Гужалоўскі, А. А. Аперацыя «Таргсін»: невядомыя старонкі індустрылізацыі ў БССР / А. А. Гужалоўскі // Беларус. гіст. часоп. – 2021. – № 9. – С. 3–10.

8. Мазец, В. Г. Тэндэнцыі нацыянальна-адукацыйнай палітыкі ў БССР (1944–1985) / В. Г. Мазец // Гіст.-археал. зб. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Вып. 25. – С. 159–164.

9. Нестерович, Н. Б. Общественно-политические преобразования (1954–1964 гг.) / Н. Б. Нестерович // История белорусской государственности : в 5 т. / А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2020. – Т. 5. – С. 48–88.

10. Маржала, Т. В. Партыйна-дзяржаўная палітыка ў сферы арганізацыйнай перабудовы агульнаадукацыйнай школы БССР (1945–1959 гг.) / Т. В. Маржала // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці (да 90 годдзя ўтварэння БССР) : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 27 лют. 2009 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: А. І. Андарала [і інш. ] ; навук. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2009. – Ч. 2 : Гісторыя беларускай дзяржавы (1919 г. – пач. XXI ст. ). – С. 80–83.

11. Народное хозяйство БССР : стат. сб. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1963. – 511 с.

12. Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах, 1918–1988 / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; подг. В. А. Бобков [и др.]. – 2-е изд., перераб. и доп. – Мінск : Беларусь, 1988 – 254 с.

13. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов пленумов ЦК / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; под ред. Г. Г. Бартошевича [и др. ]. – Мінск : Беларусь, 1987. – Т. 6 : 1966–1975. – 623 с.

14. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 2019. Арк. 47.

15. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 97. Спр. 228. Арк. 23.

16. НАРБ. – Ф. 218. Воп. 7. Спр. 277. Арк. 19.

17. Войков, М. И. К вопросу о колличественном и качественном составе рабочего класса / М. И. Войков // Рабочий класс в процессах модернизации России. Исторический опыт. – М. : Экон. демократия, 2001. – С. 166–175.

18. Соколов, А. К. Драма рабочего класса и перспективы рабочей истории в современной России / А. К. Соколов // Социальная история – 2002 : ежегод. – М. : Рос. полит. энцикл. – 2005. – С. 7–52.

19. Растаргуеў, А. І. Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў у Беларусі (1959–1966) / А. І. Растаргуеў // Нар. авета. – 1990. – № 6. – С. 76–78.

20. Фомин, В. М. Совершенствование подготовки и повышение квалификации рабочих промышленности Белорусской ССР в период развитого социализма (1959–1970) / В. М. Фомин, Н. Д. Левкович // Вопр. истории : межвуз. сб. – Минск : БГУ, 1974. – Вып. 1. – С. 69–87.

21. Прохорович, П. В. Партийная забота о рабочей смене. Деятельность Компартии Белоруссии по развитию профессионально-технического образования молодежи (1966–1976) / П. В. Прохорович. – Минск : Выш. шк., 1977. – 160 с.

REFERENCES

1. Babosov, Ye. M. Social’nyje aspiekty nauchno-tiekhnichieskoj rievoliucii / Ye. M. Babosov. – Minsk : BGU, 1976. – 477 s.

2. Babosov, Ye. M. Viedushchaja rol’ rabochiego klassa v istorichieskikh ramkakh zrielogo sociallizma. Social’noje razvitije jego osnovnykh otriadov / Ye. M. Babosov // Tez. dokl. Vsiesojuz. konf. «Rabochij klass: pokazatieli politichieskoj, trudovoj i nravstiennoj aktivnosti». – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1984. – S. 3–8.

3. Korshuk, V. K. Vozrastanije rukovodiashchiej roli partii v kommunistichieskom stroitiel’stvie (na matierialakh kompartii Bielarusi) 1959–1973 / V. K. Korshuk. – Minsk : Bielarus’, 1974. – 432 s.

4. Bieliakovich, N. N. Social'naja aktivnost' rabochiego klassa / N. N. Bieliakovich. – Minsk : BGU im. V. I. Lenina, 1978. – 104 s.

5. Istorija rabochiego klassa Bielorusskoj SSR : v 4 t. / riedkol: I. Ye. Marchienko [i dr.]. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1987. – T. 4 : Rabochij klass BSSR na etapie soviershenstvovanija socializma (1961–1986). – 510 s.

6. Smiekhovich, N. V. Istorija sovietskogo gosudasrtva v zierkale «novoj» istorichieskoj nauki Rossii (koniec XX – nachalo XXI vieka) / N. V. Smiekhovich // Hist. arkhieal. zb. / hal. red. A. A. Kavalienia. – Minsk : Bielarus. navuka, 2022. – Vyp. 36. – S. 63–82.

7. Huzhalouski, A. A. Apieracyja «Tarhsin»: nieviadomyja staronki industrializacyi u BSSR / A. A. Huzhalouski // Bielarus. hist. chasop. – 2021. – № 9. – S. 3–10.

8. Maziec, V. H. Tendencyi nacyjanalna-adukacyjnaj palityki u BSSR (1944–1985) / V. H. Maziec // Hist.-archieal. zb. – Minsk : Bielarus. navuka, 2010. – Vyp. 25. – S. 159–164.

9. Niestierovich, N. B. Obshchiestvienno-politichieskije prieobrazovanija (1954–1964 gg.) / N. B. Niestierovich // Istorija bielorusskoj gosudarstviennosti : v 5 t. / A. A. Kovalienia [i dr.]. – Minsk : Bielarus. navuka, 2020. – T. 5. – S. 48–88.

10. Marzhala, T. V. Partyjna-dziarzhaunaja palityka u sfiery arhanizacyjnaj pierabudovy agul'naadukacyjnaj shkoly BSSR (1945–1959 hh.) / T. V. Marzhala // Aktual'nyja prabliemy stanauliennia i razviccia bielaruskaj dziarzhaunasci (da 90-hoddzia utvarennia BSSR) : materyjaly Resp. navuk.-tearet. kanf., Minsk, 27 liut. 2009 g. : u 2 ch. / Bielarus. dziarzh. pied. un-t imia M. Tanka ; redkal.: A. I. Andarala [i dr.] ; navuk. red. A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2009. – Ch. 2 : Historyja bielaruskaj dziarzhavy (1919 h. – pach. XXI st.). – S. 80–83.

11. Narodnoje khoziajstvo BSSR : stat. sb. – Minsk : Gos. izd-vo BSSR, 1963. – 511 s.

12. Kommunistichieskaja partija Bielorussii v cifrakh, 1918–1988 / In-t istorii partii pri CK KPB, Filial In-ta marksizma-lieninizma pri CK KPSS ; podg. V. A. Bobkov [i dr.]. – 2-je izd., pierierab. i dop. – Minsk : Bielarus', 1988. – 254 s.

13. Kommunistichieskaja partija Bielorussii v riezoliucijakh i rieshenijakh s'jezdov plienumov CK / In-t istorii partii pri CK KPB, Filial In-ta marksizma-lieninizma pri CK KPSS ; pod ried. G. G. Bartoshevicha [i dr.]. – Minsk : Bielarus', 1987. – T. 6 : 1966–1975. – 623 s.

14. Nacijanal'ny arkhiu Reapubliki Bielarus' (NARB). – F. 4p. Vop. 81. Spr. 2019. Ark. 47.

15. NARB. – F. 4p. Vop. 97. Spr. 228. Ark. 23.

16. NARB. – F. 218. Vop. 7. Spr. 277. Ark. 19.

17. Vojkov, M. I. K voprosu o kollichiestviennom i kachiestviennom sostavie rabochiego klassa / M. I. Vojkov // Rabochij klass v processakh modernizacii Rossii. Istorichieskij opyt. – M. : Ekon. diemokratija, 2001. – S. 166–175.

18. Sokolov, A. K. Drama rabochiego klassa i pierspiektivy rabochiej istorii v sovriemiennoj Rossii / A. K. Sokolov // Social'naja istorija – 2002 : jezhegod. – M. : Ros. polit. encikl. – 2005. – S. 7–52.

19. Rastarhujeu, A.I. Padrychtouka kvalifikavanych rabochych kadrau u Bielarusi (1959–1966) / A. Rastarhujeu // Nar. avieta. – 1990. – № 6. – S.76–78.

20. Fomin, V. M. Soviershenstvovanije podgotovki i povyshenije kvalifikacii rabochikh promyshliennosti BielorusskoyjSSR v pieriod razvitogo socializma (1959–1970). / V. M. Fomin, N. D. Lievkovich // Vopr. istorii : miezhvuz. sb. – Minsk : BGU, 1974. – Vyp. – 1. – S. 69–87.

21. Prokhorovich, P. V. Partijnaja zabota o rabochiej smienie. Diejatiel'nost' Kompartii Bielorussii po razvitiju profiessional'no-tiekhnichieskogo obrazovanija molodiozhi (1966–1976) / P. V. Prokhorovich. – Minsk : Vysh. shk., 1977. – 160 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.05.2024*